## Аднаўленне політэхнічнага інстытута ў 1945–1950 гг.

*Саханенка І.Ф., Капытка Н.А.*
Навуковы кіраўнік – канд. гіст. навук, дацэнт *Хромчанка Д.Н.*

БПІ да Вялікай Айчыннай вайны быў адной з буйнейшых навучальных устаноў у Беларусі. Тут навучалася каля 2000 студэнтаў. Але ў перыяд часовай акупацыі тэрыторыі рэспублікі нацысцкімі захопнікамі ён быў поўнасцю разбураны, абсталяванне і бібліятэка часткова знішчаны, часткова вывезены акупантамі. У першы год пасля вызвалення Беларусі аднавілі сваю дзейнасць амаль усе вышэйшыя ўстановы рэспублікі. 1 студзеня 1945 г. па рашэнню СНК Саюза ССР політэхнічны інстытут таксама пачаў сваю работу. Але існавала значная праблема: недахоп вытворчых, вучэбных і бытавых памяшканняў.

У першыя гады пасля вызвалення заняткі праводзіліся ў адзіным захаваўшымся будынку інтэрната, там жа былі лабараторыі, пакоі для студэнтаў і супрацоўнікаў.

На аднаўленне політэхнічнага інстытута было выдзелена больш чым 10 млн рублёў. Акрамя грошаў, політэхнічны інстытут атрымаў лабараторнае абсталяванне, што дало магчымасць папоўніць яго тэхнічныя і фізічныя лабараторыі. Адначасова з аднаўленнем матэрыяльнай базы ўжо з 1945 г. пачаўся навучальны працэс. З кожным годам інстытут пашыраўся. У першую пасляваенную пяцігодку ён даў краіне 750 інжынераў. Да 1950 г. тут былі ўведзены новыя спецыяльнасці і адкрыты новыя факультэты: энергетычны, тарфяны, гідратэхнічны. Акрамя таго, пачало працаваць вячэрняе аддзяленне, дзе было 3 факультэты: будаўнічы, механічны і энергетычны.

Такім чынам, можна зрабіць вывад, што нягледзячы на ўсе цяжкасці, з якімі прышлося сустрэцца пры аднаўленні інстытута, дзякуючы падтрымцы вышэйшых кіруючых органаў, вялікай самааддачы прафесарскага і выкладчыцкага саставу, студэнтаў, яго работа была нармалізавана,што дазволіла забяспечыць краіну высокакваліфікаванымі кадрамі, якія былі неабходны ў пасляваенны час для аднаўлення народнай гаспадаркі і культурнага жыцця БССР.